ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ЯЎРЭЙСКІЯ НЕКРОПАЛІ МЯСТЭЧАК МІНСКАЙ ГУБЕРНІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ): ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ

АЛЯКСАНДР ПЕТУХОЎ

***Анатацыя:*** Аўтарам разглядаюцца пытанні, звязаныя з выяўленнем, картаграфаваннем, пастаноўкай на ўлік яўрэйскіх могілак як помнікаў гісторыі і культуры. Закранаецца спецыфіка яўрэйскай пахавальнай этнакультуры і роля могілак у жыцці лакальнай яўрэйскай абшчыны. Акрэсліваецца перспектыва выкарыстання атрыманых ведаў у гістарычных і сумежных гуманітарных даследаваннях.

***Ключавыя словы:*** мястэчка, штэтл, мацева, эпіграфіка, іўрыт.

# JEWISH NECROPOLEIS OF THE MINSK PROVINCE TOWNS (LATE 18TH – EARLY 20TH CENTURIES): PROBLEMS AND PROSPECTS OF STUDY

***Abstract:*** The author considers questions related to the identification, mapping and registration of Jewish cemeteries as monuments of history and culture. The specificity of the Jewish funeral ethnic culture and the role of cemeteries in the life of the local Jewish community is addressed. The prospects of using the gained knowledge in historical and other related human studies are outlined.

***Keywords:*** Town, Shtetl, Matseva, Epigraphy, Hebrew.

Яўрэйскія некропалі, як і могілкі прадстаўнікоў іншых канфесій на тэрыторыі Беларусі, сталі аб'ектам навуковага даследавання толькі на пачатку XXI стагоддзя (Сямашка, 2014; Петухов, 2014; Копчёнова, 2013). Кожны з даследчыкаў у меру сваёй цікавасці, тэхнічных магчымасцяў праводзіў вывучэнне на канкрэтным помніку, не прэтэндуючы на ахоп усіх некропаляў Беларусі. У сувязі з гэтым вельмі актуальным з'яўляецца правядзенне палявых даследаванняў у гарадах, мястэчках і нават у асобных сельскіх паселішчах на прадмет выяўлення, фіксацыі і ўвядзення ў навуковы абарот мацеў (яўрэйскіх надмагілляў, літаральна з іўрыта "ўзведзеная"), якія ўяўляюць каштоўнасць для шырокага кола даследчыкаў-гуманітарыяў.

У сувязі з гэтым асаблівую цікавасць уяўляюць яўрэйскія некропалі ў мястэчках Беларусі. Гэта звязана з тым, што ў іх не стаяла (ці стаяла, але не так "горача", як у паваенным Мінску і іншых буйных гарадах) праблемы з асваеннем "новай" навакольнай прасторы ды актыўным выхадам за складзеныя гістарычна межы дадзенага населенага пункта. Тым самым многія могілкі мінулі зону рызыкі трапіць у гаспадарчы зварот і захаваныя для будучых даследчыкаў. У буйных гарадах сітуацыя з захаванасцю старадаўніх некропаляў была і ёсць значна горшая, што звязана з больш заўзятай і татальнай рэалізацыяй нацыянальна-культурнай і канфесійнай палітыкі савецкай уладай ды натуральнымі патрэбамі горада ў рэгулярных зменах і ўдакладненнях гарадскога ландшафту. Яскравым прыкладам тут можа паслужыць "шагалаўскі" Віцебск, дзе ў 1920–1930-х гадах было зачынена 3 з 4 яўрэйскіх могілак, а на пакінутым некропалі мацевы датуюцца пачаткам XX стагоддзя, пры гэтым многія з іх "не in situ", прынесеныя сюды пры ліквідацыі іншых могілак (Подлипский и Ривкин, 2003: фотададаткі да кнігі).

У межах зацікаўлення аўтара гэтых радкоў знаходзяцца перадусім яўрэйскія некропалі мястэчак Мінскай губерні (канца XVIII – пачатку XX стагоддзя), але нават на матэрыялах гэтага абранага рэгіёна кідаецца ў вочы шэраг актуальных праблем з даследаваннем яўрэйскіх могілак ва Усходняй Еўропе ды Беларусі, у прыватнасці:

1. Амаль павальная адсутнасць ведання мовы іўрыт у багажы прафесійных ведаў у даследчыкаў у галіне гістарычнай урбаністыкі Беларусі.

2. Адсутнасць картаграфавання. Аўтар дадзеных радкоў цягам 2013–2014 гадоў, будучы ўдзельнікам міжнароднага цыкла вэбсемінараў па яўрэйскай эпіграфіцы, які быў зладжаны паважанай асацыяцыяй даследчыкаў у галіне юдаікі "Сэфер", стаў сведкам сітуацыі, калі арганізатары і ўдзельнікі семінара не мелі зыходнай картаграфаванай інфармацыі па наяўнасці/адсутнасці яўрэйскіх могілак ва Усход-

няй Еўропе. Пастаўленая праблема вырашалася наспех, супольна і без удакладнення на мясцовасці.

3. Маюцца праблемы і з прызнаннем за дадзенымі могілкамі статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці. Дзеля справядлівасці тут варта адзначыць, што не маюць гэтага статуса і старыя могілкі іншых этнаканфесійных супольнасцяў. У выпадку з яўрэйскімі могілкамі гэтая праблема ўскладняецца праз няведанне іўрыта ды недаследаванасць дадзенай групы могілак.

Могілкі дакладна існавалі:

1) Мінскі павет: Рубяжэвічы, Гарадок, Стоўбцы, Камень, Ракаў, Свержань, Івянец, Заслаўе;

2) Бабруйскі павет: Азарычы, Глуск, Урэчча, Любань, Свіслач, Парычы;

3) Пінскі павет: Лагішын, Пагост Загародскі, Целяханы, Столін;

4) Мазырскі павет: Каролін (Ельск), Капаткевічы, Лельчыцы, Леніно, Лахва;

5) Рэчыцкі павет: Лоеў, Нароўля, Калінкавічы;

6) Слуцкі павет: Клецк, Капыль, Старобін, Пагост, Вызна, Цімкавічы, Грозаў, Бабоўня;

7) Навагрудскі павет: Любча, Уселюб, Дзяляцічы, Гарадзішча, Новая Мыш, Мір, Турэц;

8) Ігуменскі павет: Узда, Лоша, Шацк, Вузляны, Смілавічы, Дукора, Пухавічы, Беразіно, Клічаў, Багушэвічы;

9) Барысаўскі павет: Красналукі, Смалявічы, Плешчаніцы, Халапенічы.

Калі сцісла акрэсліваць накірунак і перспектывы далейшых даследаванняў, варта звярнуць увагу на наступныя істотныя моманты.

**Месцазнаходжанне мацевы ў планіроўцы могілак:** 1) На большасці могілак было прынята вылучаць асобную частку для пахавання рабінаў і іншых значных ці выбітных сваёй набожнасцю чальцоў мясцовай грамады, а для пахавання коханаў, іх жонак ці іх незамужніх сясцёр адводзілі шэраг ля могілкавай агароджы на дыстанцыі васьмі локцяў (каля 4 метраў) ад паралельнага шэрага пахаванняў, каб крэўныя родзічы-кохены мелі магчымасць прысутнічаць на пахаваннях сваіх родных ці адведваць іх магілы, знаходзячыся на дазволенай дыстанцыі ў чатыры локці ад іншых магіл. 2) На некаторых могілках мужчын і жанчын хавалі ў розных шэрагах. Вераадступнікі, адлучаныя ад абшчыны, і самагубцы хаваліся ў аддаленым куце могілак ці за агароджай.

**Мова мацевы як паказчык устойлівасці традыцыйнага ўкладу.** У XIX стагоддзі ў большасці краін Заходняй Еўропы ўсё часцей з'яўляюцца эпітафіі на мясцовых мовах (у 1870-х гадах разгарэлася палеміка паміж рабінамі аб дапушчальнасці ўжывання ў эпітафіі на яўрэйскіх надмагіллях разам з надпісамі на іўрыце надпісаў на іншых мовах). Ва Усходняй Еўропе

надпісы на мясцовых мовах з'явіліся ў эпітафіі на яўрэйскіх надмагіллях галоўным чынам у XX стагоддзі. Тады ж на надмагіллях сталі змяшчаць і забароненыя рэлігійнай традыцыяй (пар. Кніга Зыходу 20: 4–5; Другазаконне 4: 16–19; 5: 8) партрэтныя выявы памерлых.

**Сімволіка ў яўрэйскім надмагільным мастацтве:**

- кісці рук у традыцыйным адпаведным жэсце (глядзі Біркат-каханім) – магіла кохена;
- старажытныя музычныя інструменты або збан – магіла лявіта;
- рукі над запаленымі свечкамі або запаленыя свечкі ў суботніх падсвечніках – магіла жанчыны;
- статак без пастуха, разгорнутая кніга або некалькі карэньчыкаў кніг з назвамі – магіла рабіна ці аўтара рэлігійных твораў;
- гусінае пяро (асобна або ў руцэ) – перапісчыка святых тэкстаў;
- нажніцы – кравец;
- ланцужок з каралямі ці іншыя ўпрыгажэнні – ювеліра;
- скрынка або кубак для збору ахвяраванняў, рука, якая падае міласціну, паказвалі на шчодрасць нябожчыка.

**Фактычная і прамая інфармацыя:** 1) Даты нараджэння і смерці; 2) Прозвішча. Імя. Імя па бацьку; 3) Узрост. Працягласць жыцця; 4) Наяўнасць і колькасць блізкіх родзічаў; 5) Род дзейнасці і роля ў мясцовай грамадзе.

Магчымыя накірункі выкарыстання канкрэтнай і фактычнай інфармацыі гісторыкамі:

- Генеалогія, гістарычная біяграфістыка.
- Дынаміка этнакультурных працэсаў. Стан моўнай культуры. Іменаслоў. Эстэтычныя густы, рэлігійнасць.
- Дэмаграфічныя паказчыкі (колькасць дзяцей, смяротнасць, працягласць жыцця).
- Заможнасць і фінансавыя магчымасці.
- Дацiроўка могілак.

**Высновы.** Яўрэйскія могілкі – унікальны этнакультурны феномен, які адлюстроўвае працэсы жыццядзейнасці лакальнай яўрэйскай супольнасці. Яны з'яўляюцца люстэркам культурных, эканамічных працэсаў у грамадзе. Яны даюць глебу для працы гісторыкаў, эпіграфістаў, мастацтвазнаўцаў і іншых.

### *Бібліяграфія*

1. Копчёнова, Ирина, отв. ред. (2013). *Желудóк: Память о еврейском местечке.* Москва: Институт славяноведения.

2. Петухов, Александр (2014). «Некрополь как феномен еврейской этнокультуры Беларуси (на примере м. Паричи)», *Европа: актуальные проблемы этнокультуры. Материалы VII международной научно-теоретической конференции.* Минск: БГПУ: 244–246.

3. Подлипский, Аркадий и Ривкин, Михаил (2003). *Наш вечный дом (Из истории еврейских кладбищ в Витебске).* Витебск: Витебская областная типография.

4. Сямашка, Вольга (2014). "Праблемы аховы гістарычных могілак Беларусі", *Трэці Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі Працоўныя матэрыялы. Том 3.* Каўнас: 427–430.